**УСТАНОЎЧАЯ ДАМОВА**
**аб сумеснай дзейнасці чальцоў Выбарчай камісіі**
**па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання**

6 лютага 2026 года                                                                                                    г. Варшава

*Добраахвотна прымаючы на сябе адказнасць за арганізацыю і правядзенне выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання,*

*Выказваючы ўдзячнасць за давер, аказаны нам Каардынацыйнай радай праз абранне ў склад Выбарчай камісіі,*

*Пагаджаючыся выконваць абавязкі і паўнамоцтвы, вызначаныя Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную Раду,*

*Усведамляючы часовы і мэтавы характар паўнамоцтваў Выбарчай камісіі,*

*Імкнучыся забяспечыць празрыстую, бяспечную і надзейную электаральную працэдуру,*

Мы, Яраслаў Бекіш, Алена Жылачкіна (Жываглод), Пётр Маркелаў, Алена Прыходзька і Дзмітрый Фурманаў (далей – Выбарчая камісія), заключылі дамову пра наступнае.

1. Выбарчая камісія ствараецца выключна ў мэтах правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду IV склікання. Кампетэнцыя і дзейнасць Выбарчай камісіі вызначаецца згодна з прынятым 20 студзеня 2026 года Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную Раду (далей Палажэнне) і не можа супярэчыць яму.
2. Выбарчая камісія абірае са свайго складу Старшыню таемным галасаваннем простай большасцю галасоў, што зацвярджаецца адпаведным рашэннем.
3. Пасяджэнні Выбарчай камісіі праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей раз на два тыдні.
4. Склад Сакратарыята Выбарчай камісіі, парадак яго фармавання і ўзаемадзеяння з апошняй вызначаюцца Выбарчай камісіяй.
5. Выбарчая камісія распрацоўвае палітыку бяспекі правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду ў адпаведнасці з Агульным рэгламентам абароны персанальных дадзеных Еўрапейскага Саюза (GDPR) і зацвярджае яе сваім рашэннем.
6. Выбарчая камісія самастойна вызначае форму і сродкі правядзення галасаванняі і ажыццяўляе падлік галасоў падчас выбараў у Каардынацыйную Раду. Пры неабходнасці да працэсу правядзення галасавання запрашаюцца спецыялісты ў галіне лічбавых тэхналогій пры ўмове падпісання імі палітыкі бяспекі.
7. Выбарчая камісія забяспечвае ўмовы для назірання за выбарамі, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палітыкай бяспекі.
8. Члец Выбарчай камісіі, каментуючы ход выбарчага працэсу і датычных да яго абставінаў, мусіць у першую чаргу кіравацца калегіяльна прынятымі рашэннямі, палітыкай бяспекі, павагай да прыватнага жыцця і ўстрымлівацца ад негатаўнай крытыкі на адрас удзельнікаў выбарчага працэсу.
9. Дзеянні чальцоў Выбарчай камісіі, не ўрэгуляваныя нарматыўнымі дакументамі і прынятымі ёй рашэннямі, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці с прынцыпамі разумовасці і добрасумленнасці.

Яраслаў Бекіш
Алена Жылачкіна (Жываглод) Elena Zhilochkina
Пётр Маркелаў
Алена Прыходзька
Дзмітрый Фурманаў